*Вялікі, А. Ф.* Польская гістарыяграфія па пытанні абмену насельніцтвам паміж БССР і Польшчай. 1944–1946 гг. / А. Ф. Вялікі // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. / Редкол.: В. Н. Сидорцов. (отв. ред.) и др. – Мн: БГУ, 2004. – С. 139–141.

**А. Ф. ВЯЛІКІ**
***Рэспубліка Беларусь, г. Мінск***

# ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПА ПЫТАННІ АБМЕНУ НАСЕЛЬНІЦТВАМ ПАМІЖ БССР І ПОЛЬШЧАЙ. 1944–1946 гг.

Праблема абмену насельніцтвам дастаткова глыбока распрацоўваецца польскімі гісторыкамі. Значны інтарэс уяўляюць працы К. Кёрстэн, М. Мотас, Я. Чарнікевіча, А. Главацкага, зборнік дакументаў пад рэдакцыяй С. Цысельскага [1– 5]. Аднак у сваіх працах яны разглядаюць працэс вяртання палякаў на Радзіму з СССР і ў яго кантэксце – з БССР, не разглядаючы дэталёва своеасаблівасці, у якіх яно ажыццяўлялася ў Беларусі.

Найбольш грунтоўна падышоў да разгляду пытання аб перасяленні насельніцтва з БССР у Польшчу Я. Чарнікевіч. На вялікім статыстычнам матэрыяле з польскіх архіваў ён прааналізаваў сацыяльны, прафесійны, узроставы склад ад'ехаўшых, вызначыў раёны Беларусі, адкуль выехала найбольшая і найменьшая колькасць насельніцтва, паказаў дынаміку працэсу перасялення і г. д. Аднак, надаючы значную ўвагу аналізу колькасных паказчыкаў, ён зусім не разглядае і не аналізуе дзейнасць упаўнаважаных ПКНВ, прадстаўнікоў СНК БССР, складанасці і супярэчнасці гэтага працэсу, эвалюцыю адносін кіраўніцтва БССР да працэсу перасяленя і г. д.

Значным недахопам манаграфіі Я. Чарнікевіча з'яўляецца тое, што ён, аналізуючы колькасныя паказчыкі, карыстаецца толькі статыстычнымі матэрыяламі з польскіх архіваў, ігнаруючы аналагічны матэрыял, што захоўваецца ў архівах Беларусі. Ігнараванне матэрыялу беларускіх архіваў спрыяла з'яўленню ў яго працы істотнай памылкі, якую паўтарылі польскія, беларускія, расейскія, англійскія гісторыкі, калі разглядалі гэтую тэму. Так, у кнігах У. Снапкоўскага, В. Парсаданавай, Ю. Сядлецкага, Я. Мірановіча, К. Сворда прыводзяцца звесткі аб тым, што ў снежні 1944 г. не адбывалася перасялення палякаў з БССР у Польшчу і толькі на пачатку 1945 г. пачынаецца іх адпраўка на Радзіму. Паколькі ўсе яны спасылаюцца на працу Я. Чарнікевіча, у якой адсутнічаюць гэтыя звесткі, то магчыма сцвярджаць, што ён з'яўляецца аўтарам гэтай памылкі [3, *110*]. Аднак «Советская Белоруссия» у сярэдзіне снежня 1944 г. паведамляла, што з Баранавіч, Гродна, Стаўбцоў, Ваўкавыска ўжо адправіліся першыя эшалоны (з перасяленцамі. – *А. В.*) [6, *1*]. Дакументы, якія выяўлены аўтарам у НАРБ, таксама сведчаць аб тым, што за кастрычнік – снежань 1944 г. у Польшчу было адпраўлена 1375 гаспадарак агульнай колькасцю 2991 чалавек [7, *8*].

Значную каштоўнасць уяўляе зборнік дакументаў пад рэдакцыяй С. Цысельскага. Яна заключаецца не толькі ў дакументах, але і ў тым, што аўтары, зрабіўшы агляд



літаратуры па згаданай праблематыцы, прыйшлі да высновы аб неабходнасці асэнсавання ўжо назапашанага матэрыялу і ўдакладнення тэрмінаў «рэпатрыяцыя», «эвакуацыя» ў адносінах да перасяленцаў з РСФСР і заходніх абласцей Украіны, Літвы, Беларусі, больш глыбокага аналізу матываў, якія ўплывалі на рашэнне палякаў аб перасяленні, аб неабходнасці вывучэння структуры насельніцтва на тэрыторыях, якія змяніліся ў выніку падзей 1939–1941 гг. і пасляваеннага часу, характарыстыкі міграцыйных рухаў пасля Другой сусветнай вайны, удакладнення колькасных паказчыкаў і г. д. [5].

У кантэксце сваіх прац звярталіся да разгляду вывучаемай тэмы Ю. Сядлецкі, Я. Мірановіч, П. Эбэрхардт [10; 8; 9; 12]. Я. Мірановіч у адрозненне ад папярэднікаў

засяродзіў увагу на перасяленні беларусаў з Беласточчыны ў БССР. Выкарыстаўшы значны архіўны матэрыял, ён прыводзіць дадзеныя аб колькасці беларусаў у Беластоцкім ваяводстве, іх адносінах да магчымасці пераезду ў БССР, вызначае фактары, якія ўплывалі на рашэнне беларусаў заставацца ў Польшчы альбо пераязджаць у БССР, паказвае стаўленне мясцовых уладаў да беларускага насельніцтва і ўвогуле да беларускага пытання на Беласточчыне. Неабходна заўважыць, што Я. Мірановіч не пазбягае аб'ектыўнага абмеркавання такой складанай праблемы, як тэрор польскага падполля ў дачыненні да беларусаў, якія зарэгістраваліся на выезд у БССР. Ю. Сядлецкі і П. Эбэрхардт закранулі толькі асобныя аспекты перасялення ў межах сваіх даследаванняў аб лёсах палякаў у Савецкім Саюзе і Беларусі.

Асобным радком неабходна вылучыць працу не прафесійнага гісторыка, а святара з Беласточчыны Г. Сосны [11]. Яна ўяўляе збор архіўных дакументаў (данясенні, рапарты, лісты ваяводскіх, гмінных улад), якія адлюстроўваюць пасляваенную рэчаіснасць на Беласточчыне, адносіны мясцовых уладаў да беларусаў да і пасля падпісання беларуска-польскага пагаднення аб абмене насельніцтвам. Дакументы, якія змешчаны ў зборніку, дазваляюць прасачыць эвалюцыю адносін мясцовай улады ў дачыненні да беларусаў як нацыянальнай меншасці, параўнаць лічбавыя дадзеныя аб колькасці беларусаў, прадстаўленыя гміннымі ўладамі і ўпаўнаважанымі СНК БССР па перасяленні, высвятліць матывы, якія ўтрымлівалі беларусаў Беласточчыны ад перасялення ў БССР, і інш.

Нягледзячы на адносную шматлікасць прац па адзначанай тэме, польскія гісторыкі вымушаны канстатаваць, што ім «адносна меней вядома аб ходзе перасялення (палякаў. – *А. В.*) з Беларусі ў Польшчу» у параўнанні з вывучэннем працэсу перасялення з Літвы і Украіны [5, *30*].

Такім чынам, гістарыяграфічны агляд паказвае, што двухбаковыя беларуска-польскія адносіны сярэдзіны 40-х гг., а таксама такі іх аспект, як абмен насельніцтвам, да цяперашняга часу вывучаны недастаткова, многія пытанні засталіся па-за ўвагай польскіх даследчыкаў.

1. *Kersten K.* Repatriacja ludnosci Polskej po drugiej wojnie swiatowej: studium historiczne. Wroclaw, 1974.
2. *Motas M.* Nektore kwestie dotyczace przesiedlenia ludnosci Polskej z USRR w latach 1944–1948. Warszawa, 1975.
3. *Czerniakiewicz J.* Repatriacja ludnosci polskiej z ZSRR 1944–1948. Warszawa, 1987.
4. *Glowacki A.* Przemieszenia obywateli polskich w Zwiazku Radzieckim w 1944 r. Lodz, 1989.
5. Przesiedlenie Ludnosci Polskiej z Kresow Wschodnich do Polski 1944–1947. Wybor, opracow. i red. documentow Ciesielski S. Warszsawa, 1999.
6. Началась эвакуация поляков из Белоруссии // Советская Белоруссия. 1944. 13 дек.
7. НАРБ. Ф. 787. Воп.1. Спр. 1. Т. 1. Л.8.
8. *Mironowicz E.* Białorusiny w Polsce. 1944–1949. Warszawa, 1993.
9. *Mironowicz E.* Polityka narodowosciowa PRL. Białystok, 2000.
10. *Siedlecki J.* Losy Polakow w ZSRR w latach 1939–1986. Londyn, 1988.



11. Sprawy narodowosciowe i wyznaniowe na Białostocezyzne, 1944–1948: W ocenie wladz Rzeczpospolitej Polskiej. Wybor dokumentow: Situcyjne sprawozdania woewody Bialostockiego w Białymstoku oraz Powiatowych starostow Białostockiego, Bielskpodlaskiego i Sokolskiego w latach 1944–1948 / Zebr. G. Sosna. Ryboly, 1996.
12. *Эбэрхардт П.* Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1889–1989. Мн., 1997.